*24 лютага — Дзень выбараў у Саветы народных дэпутатаў. Выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты! Аднадушна аддадзім свае галасы за кандыдатаў народа!*

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985

21 ЛЮТАГА ЧАЦВЕР

№ 6 (1456)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт

## ТЭЛЕТАЙП

*УЧОРА · СЕННЯ · ЗАЎТРА*

### Бюро парткома

на чарговым пасяджэнні вяло размову аб кіраўніцтве камітэтам камсамола універсітэта пярвічнымі камсамольскімі арганізацыямі. З паведамленнем па гэтаму пытанню выступіў сакратар камітэта камсамола А. Казулін.

На пасяджэнні была разгледжана работа студэнцкіх дыскусійных палітычных клубаў, а таксама абмеркавана практыка партыйнага кіраўніцтва камсамолам на хімічным факультэце.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### Адобрана палажэнне

аб сацыялістычным спаборніцтве на лепшую акадэмічную групу універсітэта. На чарговым пасяджэнні бюро камітэта камсамола разгледжана таксама пытанне аб падвядзенні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва паміж факультэтамі.

А. МАТУСЕВІЧ.

### Цудоўна адпачылі

і паправілі сваё здароўе ў час зімовых канікулаў студэнты універсітэта. Многія з іх ажыццявілі захапляючыя падарожжы на турыстычных паяздах у Кіеў, Львоў, Харкаў, Валгаград, Палтаву. Першая група другога курса юрыдычнага факультэта — пераможца агляду-конкурсу на лепшую вучэбную групу універсітэта — пабывала ў Ленінградзе, пазнаёмілася з помнікамі гісторыі, культуры і архітэктуры горада.

Н. ТУРОМША.

### Лыжныя гонкі

— спаборніцтвы для мужных і смелых. Нядаўна праходзіла першынство Белсавета ДСТ «Буравеснік» па гэтаму віду спорту. Трэцяе агульнакамандкае месца заняла зборная універсітэта. Гэта поспех, бо апошні раз прызёрамі нашы лыжнікі былі дзевяць гадоў назад. А хакеісты не парадавалі аматараў і сёлета. Яны былі пятымі.

А. БАЛДЗІН.

РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!

## ШЛЯХ ДА СТАЛАСЦІ

**І справа была не ў тым, што ён здаў залік. Не такая ўжо гэта падзея, каб за яе віншавалі вось так, абступіўшы ўсёй групай. Аляксандр Дземяшкевіч пераводзіў позірк з аднаго аднакурсніка на другога.**

**— Кандыдатам у дэпутаты гарсавета цябе вылучылі! — выгукнуў нарэшце нехта са студэнтаў...**

ВУЧЭБНЫ дзень спланаваны так, што Аляксандр абавязкова праходзіць па шостаму паверху. Там знаходзіцца стэнд «Лепшыя студэнты факультэта». Сярод выдатнікаў вучобы і яго здымак. Дземяшкевіч глядзіць на Дземяшкевіча. І штодня гэты позірк — бы ўкол дакору. Справа ў тым, што ў апошнюю сесію Аляксандр нечакана для сябе атрымаў чацвёрку. Але здымак — сярод выдатнікаў. Ці ж не падстава для перажыванняў? Тым больш, дзе б ні вучыўся хлопец, ён заўсёды быў выдатнікам. І ў школе, і ў тэхнікуме, і ў вучэбным падраздзяленні ў час службы ў арміі.

За плячыма студэнта 2-га курса юрыдычнага факультэта падзей нямала, іх бы, пэўна, хапіла на цэлы вечар успамінаў. Але калі трэба пісаць аўтабіяграфію, тэкст змяшчаецца на адной старонцы лістка з канспекта лекцый: «Вучыўся, працаваў, служыў, паступіў...» Вось і ўсё. На першы погляд так дэталёва проста, нічога незвычайнага. Але за кожным радком і словам біяграфіі — станаўленне асобы, гартаванне характару.

### «ВУЧЫЎСЯ...»

ВУЧЫЦЦА АЛЕСЬ любіў. Гэта ў яго ад маці. Веры Уладзіміраўны, выкладчыцы матэматыкі Балашоўскай вась-

(Заканчэнне на 2-й стар.).






*23 ЛЮТАГА — ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТУ. ВІНШУЕМ СА СВЯТАМ ВАС, ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!*

СТУДЭНТ І НАВУКА

# ШТО ЗАХАПЛЯЕ? ЛЮБОЎ ДА ЛІТАРАТУРЫ

ІХ МОЖНА часта бачыць разам. Яны заўсёды нешта абмяркоўваюць: Алег Дышлевіч з трэцяга курса, лепшы студэнт групы спецсемінара па старажытнай беларускай літаратуры і прафесар Алег Антонавіч Лойка, кіраўнік групы. За час сваёй працы ён выхаваў шмат маладых паэтаў. На занятках семінара ў Алега Антонавіча заўсёды пануе шчырасць, любоў да сваёй справы. І галоўнае — сюды прыходзяць людзі, улюбёныя ў літаратуру. Іх вабіць культурная спадчына і творчы лёс дзеячаў мінулага. Яны шукаюць падыход да таямніц старажытнасці, стараюцца знайсці тагачасны ідэал прыгажосці. Ефрасіння Полацкая... Францыск Скарына... Мікола Гусоўскі... Чым сталі яны для культуры мінулага? Чаму мы сёння так шануем іх памяць? Такія пытанні задаюць сабе выхаванцы Алега Антонавіча. А ўдзельніца семінара Ірына Згрундо шукае адказ на пытанне: ці была на самай справе сустрэча Скарыны з Гусоўскім, ці гэта гістарычная фантазія?

...Я ціха пакідаю аўдыторыю, дзе застаўся Алег Антонавіч са сваімі студэнтамі, і накіроўваюся да кафедры беларускай мовы, дзе займаецца з удзельнікамі свайго семінара загадчык кафедры Леў Міхайлавіч Шакун. Ён дапамагае студэнтам спасцігнуць гісторыю беларускай мовы. Трое з іх — лепшыя студэнткі нашага курса: Марына Лычкоўская, Наталля Лазоўская і Алена Клімовіч. Яны ўжо ўзяліся за складаную і цікавую тэму — шукаюць сувязі беларускай мовы з чэшскай. А Ларыса Смяян займаецца праблемай дзеепрыметніка ў беларускай мове канца мінулага стагоддзя. Дзяўчаты ўжо сабралі шмат матэрыялаў. Бяру ў рукі гэтыя сшыткі, старыя тоўстыя кнігі, гартаю старонку за старонкай і, здаецца, адчуваю водар роднага слова, што ад продкаў праз стагоддзі прыйшло да сваіх нашчадкаў...

Шмат іншых семінараў працуе на трэцім курсе беларускага аддзялення філалагічнага факультэта. Адным з іх кіруе прафесар, пісьменнік, вядомы даследчык беларускай літаратуры XIX стагоддзя Сцяпан Хусейнавіч Александровіч. Семінар называецца «Якуб Колас — класік беларускай літаратуры». Тэмы работ у студэнтаў самыя разнастайныя: і па біяграфіі славутага пісьменніка, і па творчым шляху, і па лепшых яго творах, якія сталі жамчужынамі нашай літаратурнай спадчыны і ўвайшлі ў скарбонку сусветнай літаратуры.

Але, бадай, самая шматлікая група спецсемінара — па літаратуры пра Вялікую Айчынную вайну. Дацэнт Вольга Васільеўна Казлова цікава і захапляюча знаёміць студэнтаў з творамі беларускіх пісьменнікаў пра гераічнае мінулае нашага народа, пра яго змаганні з ворагам. Заняткі семінара даюць асаблівы плён, бо разважанні кіраўніка заснаваны яшчэ і на ўласных успамінах.

Тут займаюцца цікаўныя, дапытлівыя людзі: Ірэна Дзядзюшка, Наталля Ганчарова, Маргарыта Барысевіч, Надзея Кажамякіна, Святлана Канапацкая, Анатоль Плужнікаў, Наталля Дубовік і іншыя. Яны з натхненнем чытаюць і вывучаюць творы пра Вялікую Айчынную вайну М. Танка, В. Быкава, І. Навуменкі, І. Шамякіна, Я. Брыля, П. Панчанкі, А. Куляшова, Р. Барадуліна.

Есць на нашым факультэце яшчэ адзін цікавы спецсемінар — «Беларуская дзіцячая літаратура», якім кіруе даследчыца беларускай дзіцячай літаратуры дацэнт Маргарыта Барысаўна Яфімава. Яна імкнецца дапамагчы студэнтам зразумець спецыфіку дзіцячай літаратуры, перадаць ім любоў да дзяцей, навучыць іх шчырасці і чуласці ў адносінах да маленькіх чытачоў. Маргарыта Барысаўна дапамагла кожнаму ўдзельніку спецсемінара знайсці цікавую тэму: праблема гераізму ў беларускай дзіцячай прозе, гумар у сучаснай беларускай паэзіі для дзяцей, рэальнае і фантастычнае ў творах Янкі Маўра. Студэнты атрымалі, а некаторыя ўжо і выканалі першыя заданні па рэцэнзаванню беларускіх перыядычных выданняў для дзяцей: газеты «Піянер Беларусі», часопісаў «Вясёлка» і «Бярозка». Работа зроблена ўжо вялікая, але наперадзе шмат творчых пошукаў і перамог, шмат спадзяванняў і радасцей адкрыцця. І падыходзячы часам да сваіх сяброў з пытаннем: «Чаму выбраў гэты семінар?» звычайна чую адказ па сутнасці адзін і той жа:

— Адразу цяжка сказаць. Але, напэўна, таму, што люблю літаратуру... За што люблю? За тое, што яна дапамагае знайсці сябе...

**А. САДОЎСКАЯ,**
**намеснік старшыні СНТ філалагічнага факультэта.**

РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!

# ШЛЯХ ДА СТАЛАСЦІ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

мігадовай школы. Тут, у вёсцы Балашы Вілейскага раёна, і нарадзіўся Аляксандр Дземяшкевіч. Тут прайшлі яго беcклапотныя і такія цудоўныя гады дзяцінства. Гады, напоўненыя непаўторнымі адкрыццямі: дзівоснай прыгажосці краявідаў за ваколіцай роднай вёскі, чароўнага і захапляючага свету кніг. Чытаў запоем. І ў школе, і пасля ў тэхнікуме. Неяк выпадкова трапіў у рукі томік вершаў Канстанціна Сіманава. Алесь не толькі адкрыў для сябе яго творчасць, а па-сапраўднаму захапіўся яго героямі. І не супакоіўся, пакуль не перачытаў усё, што змог дастаць у вясковай бібліятэцы.

Мажліва адсюль бярэ свой пачатак захапленне літаратурай вайсковай тэматыкі, кнігамі пра подзвіг савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны. Але прадмет асаблівай увагі — творы пра разведчыкаў. Дземяшкевічу падабаліся мужнасць і знаходлівасць гэтых людзей, на іх ён імкнуўся быць падобным.

Навапольскі тэхнікум скончыў на выдатна. Размеркаванне атрымаў у інфармацыйна-вылічальны цэнтр горада Маладзечна. Праўда, працаваў там Алесь нядоўга. Надышоў час прызыву ў Савецкую Армію. Але перш чым яму ўручылі позву ў райваенкамаце, да сябе ў кабінет выклікала дырэктар ІВЦ. Размова была кароткай: «Можам хадайнічаць аб адтэрміноўцы. З кадрамі ў нас складана. А там — паступіш у Гомельскі дзяржаўны універсітэт на эканамічны факультэт. Накіраванне дадзім».

Што і казаць, даволі спакуслівая прапанова. Толькі Аляксандр, падзякаваўшы за клопат, адмовіўся. Чаму? Пытанне ў адно слова, але сцісла адказаць на яго немагчыма. У кожнага чалавека ёсць нейкі рубеж. І яго пераадоленне расстаўляе патрэбныя акцэнты, дае магчымасць ліквідаваць «белыя плямы» ў разуменні жыцця. Такім выпрабаваннем, праверкай на вартасць бачылася Аляксандру служба ў арміі.



### «СЛУЖЫЎ...»

ДАБОДЗІЛАСЯ нялёгка, каб не сказаць больш, аднак малады салдат стараўся з гонарам пераадолець усе цяжкасці, дапамагчы ў гэтым сваім таварышам. Ужо пасля ён скажа, што «вучэбка» навучыла цаніць узаемавыручку. Гэтая рыса вельмі спатрэбілася пасля Дземяшкевічу-студэнту.

А тады лёс распарадзіўся так, што трапіў Дземяшкевіч-салдат у Дэмакратычную Рэспубліку Афганістан. Трапіў, каб у цяжкі для народа гэтай краіны час у саставе абмежаванага кантынгенту Савецкіх войск аказаць інтэрнацыянальную дапамогу.

Пра службу сваю ў ДРА Алесь расказвае рэдка і неахвотна. Нялёгкія гэта ўспаміны. І як напамінак аб іх — ордэн Чырвонай Зоркі на лацкане яго святочнага пінжака.

### «ПАСТУПІЎ...»

ІНАКШ І БЫЦЬ не магло. Звольнены ў запас гвардыі старшына засеў за падручнікі. І як ні вабіла да сябе ціхімі затокамі прыгажуня-Вілія, як ні клікала, ні заманьвала музыка на танцпляцоўку, ён вучыў і вучыў. Ведаў, атрымаць на экзамене па гісторыі пяцёрку, якая яму, выдатніку, адчыніць дзверы ва універсітэт, нялёгка.

Ён яе атрымаў. Пасля былі, як звычайна ў студэнцкім жыцці, першая «бульба», першыя лекцыі і семінары. А неўзабаве і сесія. Аляксандр здаў яе на выдатна. І хаця гэта каштавала многіх бяссонных начэй, разумеў, што іначай яму, старасце курса, нельга.

Здзіўляе, як Дземяшкевічу ўдаецца ўсё паспець. Столькі грамадскіх даручэнняў і абавязкаў, што з ліхвой хапіла б на двух. Не кажучы ўжо пра вучобу! А тут яшчэ хочацца ў кіно на новы фільм ці ў тэатр схадзіць. Аляксандр смяецца:

— Трэба рацыянальна размяркоўваць час.

А пасля, пасур'ёзнеўшы, дадае:

— Аднак нялёгка будзе ўскласці на сябе яшчэ і дэпутацкія абавязкі. Давядзецца яшчэ больш ушчыльніць рабочы дзень.

Член камітэта камсамола факультэта, адказны за акадэмічную работу, Аляксандр Дземяшкевіч на перапынку ідзе калідорам факультэта. «Дзень добры, Аляксандр!», «Прывітанне, Саша!». Ледзь паспявае адказваць. А на юрфаку звыш сямісот студэнтаў. І ўсе яны ведаюць Дземяшкевіча. І не толькі па імені, і не толькі ў твар. Ведаюць, што з якім бы клопатам ні прыйшоў да яго, заўсёды выслухае, дапаможа, параіць. Гэта, напэўна, галоўная рыса Аляксандра — быць патрэбным людзям. Таму і вылучылі яго кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадского Савета народных дэпутатаў.

Звініць званок з апошняй «пары». Дзверы вучэбнага корпуса не паспяваюць зачыняцца. Бясконцы паток студэнтаў раствараецца ў мітусні Маскоўскай вуліцы. Аляксандр падыходзіць да прыпынку тралейбуса. Чакае. Такі звычайны, нічым асаблівым не адметны хлопец. Такі ж, як тысячы яго равеснікаў: студэнт, камуніст, салдат, кандыдат у дэпутаты Аляксандр Дземяшкевіч.

**В. ГРАМОВІЧ,**
**наш кар.**





**НА ЗДЫМКАХ:** імгненні аднаго дня Аляксандра Дземяшкевіча.
**Фота А. ВАЛОШЫНА.**

НАСУСТРАЧ 40-ГОДДЗЮ ПЕРАМОГІ

# «ПОШУК» У ПОШУКУ




### А РАПТАМ НАШ?

ЦЬМЯНЫ ФОТАЗДЫМАК, зроблены з фотакарткі на камсамольскім білеце. Максімаў Фёдар Дзмітрыевіч... У дзеючую армію яго не прызвалі па стану здароўя. Але сядзець склаўшы рукі Фёдар не мог. Нягледзячы на хваробу, ён стварае падпольную камсамольскую групу і ўзначальвае яе. 20 мая 1942 года яго група аб'ядналася з Палашаўскім партызанскім атрадам. У адным з баёў з карнікамі Фёдар загінуў. «Варожая куля абарвала жыццё маладога камсамольца, былога студэнта юрыдычнага інстытута». Іменна гэтыя радкі з артыкула «Палашаўскі бой» у газеце «Віцебскі рабочы» за 5 чэрвеня 1982 года зацікавілі студэнтаў групы «Пошук» юрыдычнага факультэта універсітэта.

Студэнт юрыдычнага факультэта... А раптам наш? Нашага, Мінскага інстытута... У артыкуле пра гэта не было сказана.

Пачаўся пошук. Была перапіска з аўтарам матэрыялу, сустрэча з камандзірам партызанскага атрада І. Ф. Сташкевічам. Былі дні напружанай работы. І як вынік — знойдзены яшчэ адзін былы студэнт Мінскага юрыдычнага інстытута.

### ПОШУК — СЛОВА НЕ ВЫПАДКОВАЕ

ГРУПА «ПОШУК». Назва гаворыць сама за сябе. Юнакі і дзяўчаты юрфака адшукваюць выкладчыкаў і студэнтаў, якія працавалі і вучыліся ў інстытуце ў перадваенныя гады.

Часам у пошуку дапамагае шчаслівы выпадак. Але ўсё ж пошукавая работа патрабуе шмат сіл, энергіі, настойлівасці. Гэта і работа ў архівах. Гэта і сустрэчы з роднымі і блізкімі, знаёмымі герояў. І яны працуюць, 19 юнакоў і дзяўчат юрыдычнага факультэта.

Есць на факультэце адзін куток, дзе заўсёды незвычайная цішыня. Святое месца. Каска... Жывыя кветкі... Мемарыяльная дошка, на якую занесены імёны юрфакаўцаў, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны. 27 імёнаў высечана золатам на белым мармуры. 27 імёнаў знайшлі юрфакаўцы... А колькі яшчэ трэба знайсці?

«Нам пашанцавала» — лічаць студэнты. Магчыма, работа мела б куды меншыя вынікі, каб не кіраваў групай прафесар Іосіф Ісакавіч Гарэлік, чалавек прынцыповы, чулы. Для яго ў пошуку няма дробязей. Ды і нельга інакш быламу франтавіку. На вайну пайшоў ён студэнтам Ленінградскага юрыдычнага інстытута. У снежні 1941 года закончыў артылерыйскае вучылішча. 26 верасня 1942 года быў паранены ў баях за горад Варонеж. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і 9 медалямі.

### «ВОРАГ БУДЗЕ РАЗБІТЫ»

ЕСЦЬ у студэнтаў запаветная мара: адкрыць у гэтым годзе першую частку музея юрыдычнага факультэта, прысвечаную Вялікай Айчыннай вайне. У экспазіцыі музея будзе выстаўлена ўсё, што знойдзена групай: фатаграфіі, дакументы, асабістыя рэчы, пісьмы герояў.

Маленькія пажаўцелыя трохвугольнікі. Пісьмы з фронту. У кожным з іх вера ў хуткую перамогу. **«Закончыцца вайна, і зноў зажывём наславу. Упэўнены, што вораг будзе разбіты. 18.VII.1941. Каган Б. З.» «Тое, пра што мы марылі на працягу трох гадоў — здзейснілася. Вы вызвалены ад нямецкага іга. Рухнула сцяна, якая аддзяляла мяне ад вас. Ніколі не было і не будзе такога радаснага дня ў маім жыцці, як той дзень, калі я даведаўся пра вызваленне маёй роднай вёскі. Шлях — наперад, на Захад. 3 чэрвеня 1944 года. Дашкоўскі У. Ф.».**

### МАЦЯРЫНСКАЕ «ДЗЯКУЙ»

ВЫПАДАК дапамог знайсці Аляксея Фралова. Аб адкрыцці першай часткі Мемарыяльнай дошкі пісала газета «Знамя юности». Гэты нумар трапіў у рукі Фраловай Агрыпіне Нікіцічне. Сярод названых імёнаў прозвішча яе сына не было. І вось са Жлобінскага раёна студэнты атрымліваюць паштоўку. Маці пісала, што Аляксей Фралоў, студэнт II курса 1940—1941 навучальнага года, затым стралок-радыст авіяцыі дальняга дзеяння, гвардыі старшы сяржант загінуў у 1943 годзе, 1 верасня.

...Першакурснікі на свой першы, а пяцікурснікі на свой апошні званок ускладаюць кветкі да Мемарыяльнай дошкі. Кветкі — працяг Вечнага агню, сімвала незгасальнай памяці ўдзячнага народа.

А пошук працягваецца. **«Можа вы нават і не ўяўляеце, якую карысную справу робіце. Калі да гэтага часу я аплаквала свайго сына адна, то зараз адчуваю, што ёсць людзі, якія раздзяляюць маё мацярынскае гора. Яшчэ раз усім вам маё мацярынскае «дзякуй» за памяць аб маім сыне. А. Н. Фралова».**

Н. ПАХОМАВА,
Н. СЕМКІНА,
студэнткі факультэта журналістыкі.

КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ

*Ала Станіславаўна Каспяровіч шмат часу аддае грамадскай рабоце. Яна неаднаразова выбіралася ў састаў партбюро фізічнага факультэта, а з 1978 года з'яўляецца членам парткома, старшынёй камітэта народнага кантролю універсітэта. Калектыў універсітэта ведае Алу Станіславаўну як чулага і прынцыповага камуніста. Імпануе яе ветлівасць і добразычлівасць.*

*Для Алы Станіславаўны універсітэт, можна сказаць, стаў родным домам. Выпускніца-выдатніца фізічнага факультэта БДУ 1967 года, яна — дацэнт кафедры цеплафізікі.*

*А. С. Каспяровіч — аўтар больш чым 35 навуковых прац. Яна з'яўляецца членам навуковага савета АН БССР па праблеме «цеплафізіка».*

*Часта прыходзяць да Алы Станіславаўны студэнты. Хто за парадай, хто за дапамогай. Прыходзяць як да выкладчыка, камуніста, проста як да чалавека, у якога заўсёды знойдзецца добрае слова і час, каб выслухаць, дапамагчы.*

*Сёлета А. С. Каспяровіч вылучана калектывам універсітэта кандыдатам у дэпутаты Маскоўскага раённага Савета народных дэпутатаў горада Мінска.*

*Фота А. ВАЛОШЫНА.*



У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ — ВУЧЭБНЫ ПРАЦЭС

**Сёння перад вышэйшай школай стаяць адказныя задачы: павышэнне якасці прафесійнай падрыхтоўкі і ідэйна-палітычнага выхавання спецыялістаў, умацаванне сувязі з прадпрыемствамі, больш поўнае выкарыстанне магчымасцей вузаўскай навукі. Неабходна дабіцца, каб у кожным калектыве ўладарыла атмасфера творчага пошуку, узаемнай павагі і патрабавальнасці.**

# НАШ ГАЛОЎНЫ КЛОПАТ

Якасць падрыхтоўкі спецыялістаў у многім залежыць ад узроўню метадычнай работы, якая праводзіцца на аснове адпаведнай метадычнай дакументацыі. Як паказала практыка, удасканальваць кіраванне якасцю выкладання дапамагаюць вучэбна-метадычныя комплексы па асобных дысцыплінах і спецыяльнасцях.

Стварэнне вучэбна-метадычных комплексаў прадугледжвае распрацоўку шэрагу метадычных дакументаў і аналіз этапаў вучэбнага працэсу з пазіцый іх мэт, прынцыпаў і форм. Паспяхова распрацоўваюць вучэбна-метадычныя комплексы па спецыяльнасцях і дысцыплінах хімічны, філалагічны, юрыдычны і біялагічны факультэты.

Метадычны матэрыял уключае шэраг абавязковых элементаў, якія вызначаюць змест і методыку ўсіх відаў заняткаў, уключаючы і карту забяспечанасці студэнтаў вучэбна-метадычнай і навуковай літаратурай. Яны садзейнічаюць павышэнню эфектыўнасці іх самастойнай работы, дапамагаюць лепш арыентавацца ў тым, дзе (у кабінеце, бібліятэцы) атрымаць тую ці іншую літаратуру. Выкладчыкі і работнікі бібліятэкі дзякуючы такой карце маюць магчымасць лепш рэгуляваць працэс папаўнення кніжнага фонду.

Вопыт паказвае, што ўкараненне вучэбна-метадычных комплексаў у практыку — працэс не менш складаны, чым іх падрыхтоўка. Яны служаць дзейсным сродкам кантролю і самакантролю выкладчыка, кіравання пазнавальным працэсам студэнтаў.

А зараз хацелася б спыніцца на выніках экзаменацыйнай сесіі. Гэта — галоўны паказчык нашай работы.

У цэлым па універсітэту абсалютная паспяховасць у параўнанні з зімовай сесіяй мінулага года павысілася на 1,8 працэнта і склала 93,38 працэнта (91,58 працэнта ў мінулым навучальным годзе). Самай высокай паспяховасці дабіліся геаграфічны факультэт — 96,4 працэнта (у 1983-84 навучальным годзе 94,81), юрыдычны — 96,12 (95,61) і факультэт журналістыкі — 95,24 (94,35) працэнта. Крыху знізілася паспяховасць у параўнанні з мінулым навучальным годам на гістфаку — 94,09 (94,26) працэнта, хімфаку — 94,47 (94,88) і факультэце радыёфізікі і электронікі — 92,24 (92,75). Паранейшаму нізкая паспяховасць на механіка-матэматычным факультэце — 91,09 і фізічным — 91,57 працэнта.

Аналізуючы вынікі зімовай сесіі, неабходна звярнуць увагу на якасны бок яе рэзультатаў. На выдатна і добра здалі экзамены 54,84 працэнта студэнтаў, а ў мінулым навучальным годзе гэты паказчык быў 55,96 працэнта. У гэтым плане лепшыя поспехі ў студэнтаў юрфака — 80,12, гістфака — 67,95 і факультэта журналістыкі — 64,94 працэнта ад агульнай колькасці студэнтаў. Нізкія якасныя паказчыкі ў студэнтаў геафака, ФПМ і механіка-матэматычнага факультэта, адпаведна 40,9; 47,94 і 49,69 працэнта.

Найбольшую колькасць нездавальняючых адзнак атрымалі студэнты механіка-матэматычнага, фізічнага факультэтаў і факультэта радыёфізікі і электронікі.

Кафедры, факультэты павінны звяртаць увагу на выкананне студэнтамі бягучых работ. Зараз вялікае значэнне набывае ацэнка атрыманых студэнтамі ведаў, якая павінна ўсебакова адлюстроўваць узровень падрыхтоўкі спецыялістаў, выявіць іх уменне творча вырашаць пастаўленыя задачы.

Патрэбна адзначыць, што кафедры палепшылі якасць распрацоўкі экзаменацыйных матэрыялаў, забяспечыўшы іх адпаведнасць з вучэбнымі праграмамі дысцыплін, накіроўваючы змест экзаменацыйных пытанняў і заданняў на глыбокую праверку ўзроўню засваення студэнтамі вучэбна-праграмнага матэрыялу, вызначэнне якасці ведаў, уменняў і навыкаў, якімі павінен валодаць будучы спецыяліст на канкрэтным этапе навучання.

Вынікі экзаменацыйнай сесіі сведчаць не толькі аб нашых поспехах, але і аб недахопах. Перш за ўсё дэканаты, кафедры, асобныя выкладчыкі яшчэ недастаткова робяць для павышэння эфектыўнасці вучэбна-выхаваўчага працэсу, своечасовага абнаўлення яго зместу, фарміравання ў студэнтаў грунтоўнай сістэмы ведаў, навыкаў, развіцця творчых здольнасцей.

Не на належным узроўні вядзецца работа па ўдасканаленню падрыхтоўкі спецыялістаў на аснове кваліфікацыйных характарыстык, у якіх вызначаны патрабаванні да выпускніка універсітэта, якія прад'яўляюцца канкрэтнай галіной народнай гаспадаркі. Змест кваліфікацыйных характарыстык павінны ведаць усе выкладчыкі універсітэта. На аснове даных характарыстык павінны складацца рабочыя вучэбныя планы і вучэбныя праграмы. Іх неабходна выкарыстоўваць пры напісанні падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, метадычных распрацовак. Яны павінны быць пакладзены ў аснову арганізацыі ўсяго вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Дэканаты, кафедры і грамадскія арганізацыі павінны падвесці вынікі першага семестра, дасканала прааналізаваць рэзультаты зімовай экзаменацыйнай сесіі і вызначыць канкрэтныя меры па павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

І. ЧЭПА,
загадчык вучэбнага аддзела універсітэта.

# ПЕРШЫЯ І НАШЫ СПАРТСМЕНКІ

СТУДЭНЦКІЯ КАНІКУЛЫ — заўсёды час падарожжаў, паходаў, цікавых сустрэч і, безумоўна, спартыўных спаборніцтваў.

У канцы студзеня ў гімнастычнай зале БДУ праходзілі Усесаюзныя спаборніцтвы спартыўных клубаў універсітэтаў СССР па мастацкай гімнастыцы. Каля сарака ўдзельніц з Масквы, Мінска, Тарту, Саратава, Адэсы, Іванава змагаліся за права называцца мацнейшымі.

За каманду нашага універсітэта выступалі Вольга Кісялёва (журфак, 1-ы курс), Вера Няхай, Ірына Нікіценка (геафак, 2-і курс), Алена Суркова (філфак, 1-ы курс), Таццяна Шыпіца (журфак, 2-і курс), Таццяна Эйсмант (мехмат, 1-ы курс).

У выніку двухдзённай барацьбы перамогу атрымала беларуская каманда. Нездарма ў народзе кажуць: дома і сцены дапамагаюць. Дарэчы, у мінулым годзе на гэтых спаборніцтвах беларускія студэнткі былі толькі пятымі. На другім месцы — каманда МДУ імя М. В. Ламаносава, на трэцім — Іванаўскі універсітэт.

У асабістым першынстве лепшых вынікаў дабілася Вольга Кісялёва. На другім месцы — студэнтка хімфака Маскоўскага універсітэта Алена Самсонава, на трэцім — наша студэнтка Вера Няхай.

**В. КЛАДНІЦКАЯ,**
студэнтка факультэта журналістыкі.

ФІЗКУЛЬТУРА **СПОРТ** ФІЗКУЛЬТУРА

# КРОПКА ПРЫКЛАДАННЯ СІЛ

**КАЛІ РАЗМОВА заходзіць пра работу, дацэнт Аляксандр Іванавіч Заўялаў нібы змяняецца, і ў вачах загараюцца іскрынкі. Твар неяк прасвятляецца, здаецца, маладзее. Мова ўпрыгожваецца красамоўнымі эпітэтамі і ўдалымі параўнаннямі...**

...Не раз у працэсе трэніровак перад Аляксандрам Заўялавым узнікалі пытанні: як лепш падвесці спартсмена да піка яго формы, як вызначыць для яго аптымальную нагрузку, якія падабраць практыкаванні? Дакладных адказаў тады ён не ведаў, але настойліва шукаў іх. Пры гэтым яскрава разумеў: ведаў у яго малавата. Як вынік — паступленне ў аспірантуру, затым работа ў БДУ імя У. І. Леніна.

Тут ён змог ва ўсеўзбраенні прыступіць да распрацоўкі навуковай тэмы: «Вызначэнне аптымальных нагрузак для спартсмена». Задача і шляхі яе вырашэння аказаліся дастаткова складанымі. Матэрыял аб'ёмам у 80 тоўстых папак збіраўся не адзін год. Неабходна было прачытаць і прааналізаваць мноства кніг па матэматыцы, хіміі, медыцыне, фізіцы, біялогіі і іншых навуках. Пры некаторых даследаваннях Заўялаў карыстаўся прыладамі, сканструяванымі ўласнымі рукамі. Нарэшце гады напружанай працы, нястомнага пошуку ўвасобіліся ў канчатковы вынік. Былі атрыманы даныя, якія дазвалялі «кіраваць» стамляльнасцю спартсмена. На практыцы распрацоўкі Заўялава пачалі правярацца з 1981 года. І вось першы сур'ёзны экзамен і першы поспех. У 1982 годзе каманда цяжкаатлетаў БССР, якая праходзіла даследаванні і тэстыраванне комплекснай навуковай групы на чале з А. Заўялавым, упершыню заняла трэцяе месца на Усесаюзных маладзёжных гульнях. Потым было трэцяе месца на VIII Спартакіядзе народаў СССР.

Патрэбна заўважыць, што спачатку ў калектывах насцярожана аднесліся да комплексных навуковых груп, і таму не ўсе спартсмены прайшлі абследаванне. Калі ж поспех аказаўся відавочным, вучоным далі поўную свабоду дзеяння. Вынік пераўзышоў усе спадзяванні: беларускія школьнікі-цяжкаатлеты ў Ташкенце ў 1984 годзе перамаглі ў агульнакамандным заліку.

Рэзультаты навуковай работы А. І. Заўялава ўжо друкаваліся ў такіх вядомых часопісах, як «Спортивная борьба», «Теория и практика физической культуры», «Физиология человека».

...Навука не стаіць на месцы. Зараз Аляксандр Іванавіч Заўялаў працуе над новай навуковай тэмай.

**К. БЕЛАВУС,**
студэнт факультэта журналістыкі.

***ТВОЙ ВОЛЬНЫ ЧАС — ТВАЁ БАГАЦЦЕ.***

# ПРАВА НА ІМЯ

**Маё першае знаёмства з народнай агітбрыгадай адбылося тады, калі нас, першакурснікаў, упершыню ў якасці студэнтаў сустракаў універсітэт. Здзівілі нас сваім майстэрствам хлопцы і дзяўчаты гэтага калектыву. Захацелася яшчэ раз сустрэцца з імі. І нарэшце такая магчымасць з'явілася.**

ЧАТЫРНАЦЦАЦЬ гадоў існуе агітбрыгада. Утворана яна на базе факультэта прыкладной матэматыкі. Але калектыў заваяваў прызнанне ва ўсім універсітэце.

У 1982 годзе агітбрыгада атрымала званне народнай.

Напэўна, асабліва памятнымі для іх засталіся тры апошнія гады. Іменна тры гады назад прыйшла ў калектыў Людміла Іосіфаўна Ярмак, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, якая стала мастацкім кіраўніком агітбрыгады.

Не ўсё, зразумела, лёгка і проста ў калектыве: не адразу ён склаўся. Не аднойчы студэнты, убачыўшы, што ствараць спектаклі і канцэрты справа нялёгкая, што артысту, нават самадзейнаму, даводзіцца шмат працаваць, хутка развітваліся з агітбрыгадай. Але тых, хто застаўся, па праву можна лічыць самаадданымі, улюбёнымі ў мастацтва людзьмі.

Сярод тых, хто з'яўляецца ўдзельнікам агітбрыгады ўжо больш чым два гады, Юрый Курчонак, аспірант ФПМ, аўтар многіх сцэнарыяў, Наталля Андрухава, Святлана Кузьміцкая, Людміла Півавар, Наталля Данкова, Ігар Бібартас і многія іншыя.

...Ідзе рэпетыцыя. Рыхтуецца мюзікл «Стварэнне чалавека». Пачынаецца яна з самай звычайнай гутаркі: расказваюць адзін аднаму навіны, а пра мюзікл — ніводнага слова. Ці амаль ніводнага. Потым я пачынаю разумець: такой абстрактнай гутаркай Людміла Іосіфаўна настройвае артыстаў на сур'ёзную справу. Яны ўжо не адчуваюць напружання, смела паднімаюцца на сцэну.

Цяпер агітбрыгада рыхтуе два спектаклі: «Стварэнне чалавека» і «Этыкет не для графіні», сцэнарый да якога напісала Л. І. Ярмак. Ідзе таксама работа над працягам спектакля «Ах, гэта музыка!»

У рабоце калектыву дапамагаюць, безумоўна, дэканат, камітэт камсамола факультэта, студэнцкі клуб. Але праблем хапае. Не такія, напрыклад, хацелася б мець касцюмы, не хапае патрэбнай апаратуры. Але гэта не перашкоды для выдатнай работы калектыву. Ён па-ранейшаму плённа працуе, яго ўдзельнікі поўныя творчых задум, планаў, якія, верыцца, абавязкова збудуцца.

**М. КРАПАК,**
студэнтка факультэта журналістыкі.

***МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ***

# УРОКІ ДРУЖБЫ

**Калі Беатрыс даведалася аб будучай педагагічнай практыцы па рускай мове, то і ўзрадавалася, і крыху перапалохалася. Узрадавалася, таму што праца педагога ёй па душы, а крыху перапалохалася — дык гэта зразумела: ёй, кубінскай дзяўчыне, патрэбна было праводзіць урокі рускай мовы на падрыхтоўчым факультэце для замежных студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна. А гэта так няпроста, тым больш, што, нягледзячы на пяць гадоў вучобы ў Савецкім Саюзе, яна так і не здолела пазбавіцца ад акцэнту.**

**— Ці прымуць мяне? Ці здолею дасягнуць мэты навучання? Як лепш правесці ўрок? — усе гэтыя пытанні дзяўчына задавала сабе напярэдадні першага залiковага ўрока. Ды і тэма дасталася няпростая — «Масква — сталіца СССР».**

ГРАМАТЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛ мы праходзім без асаблівых цяжкасцей, думала Беатрыс. А вось як лепш расказаць пра Маскву?

І яна ўспомніла словы кіраўніка педагагічнай практыкі, калі ён гаварыў, што яны, студэнты з Кубы, якія ведаюць сапраўдную цану інтэрнацыянальнай дружбы, павінны яшчэ больш згуртаваць шматнацыянальны калектыў падрыхтоўчага факультэта.

Беатрыс задумалася. Што ведае яна пра дружбу? У тую памятную для яе кубінскую вясну ёй было пяць гадоў. Бесклапотнае дзяцінства. Навакольны свет з пышнай трапічнай прыродай, блакітным небам і морам, пяшчотным сонцам і добрымі дарослымі быў такім цудоўным. А дзіцячы сад, куды хадзіла Беатрыс, здаваўся ёй казачным палацам. Прасторны, светлы, з вялікай колькасцю цацак.

...Будынак загарэўся, калі дзеці спалі. Нечая бязлітасная рука абліла гаручым лесвіцы і ліфты, каб з будынка нельга было выйсці. Беатрыс была малая і не да канца разумела ўвесь жах таго, што адбываецца. Яна толькі-толькі прачнулася, калі чыесьці моцныя рукі падхапілі яе і панеслі скрозь агонь і дым уніз. Светлавалосы мужчына нешта гаварыў ёй, супакойваў, а яна не разумела ніводнага слова. Мужчына гаварыў на незразумелай мове.

Тады вынеслі ўсіх дзяцей. Беатрыс не раз успаміна пра гэты пажар, калі вырасла. За сваё яшчэ кароткае жыццё яна не раз была сведкай такіх вось дыверсій, якія праводзілі ворагі Кубы. А тады з палаючага дома яе вынес рускі. Яго яна добра запомніла. Дом, у якім жылі савецкія спецыялісты, стаяў непадалёку ад дзіцячага сада. Аднымі з першых прыбеглі рускія да гарэўшага будынка, разам з кубінцамі выносілі дзяцей.

Словы «рускі», «савецкі» часта вымаўляліся ў доме Беатрыс. Яе бацька, афіцэр кубінскай арміі, расказваў пра Савецкі Саюз, дзе аднойчы пабываў. Ды і маці, работнік прэсы, часта вымаўляла гэтыя словы.

...Беатрыс вырашыла паказаць студэнтам больш паштовак з відамі Масквы, пагартаць альбомы. У яе была немалая іх калекцыя. Сёе-тое сабралі аднакурснікі.

«Самае галоўнае, — думала Беатрыс, — патрэбна расказаць пра Маскву як пра горад, які ў гэтым годзе будзе прымаць Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў». Беатрыс была ўдзельніцай папярэдняга, Гаванскага фестывалю. О, гэта было сапраўднае свята!

Тады моладзь Кубы энергічна рыхтавалася да фестывалю. Упершыню сусветны на кубінскай зямлі! Некалі пра гэта немагчыма было нават марыць! Хацелася прыняць фестываль на самым высокім узроўні, паказаць поспехі сваёй сацыялістычнай радзімы.

Беатрыс вучылася ў школе. І разам са сваімі таварышамі змагалася за права ўдзельнічаць у форуме моладзі. «Выдатнай вучобай і рэвалюцыйнай работай сустрэнем фестываль!» — пад такім лозунгам жылі і працавалі школьнікі ў той час. Беатрыс — круглая выдатніца — была сакратаром раённай арганізацыі Саюза маладых камуністаў.

...Калі Беатрыс атрымала пісьмо з Міністэрства адукацыі, у якім паведамлялася, што яна едзе вучыцца ў Савецкі Саюз, радасці яе не было мяжы. Ажыццяўлялася даўняя мара. І хаця чытала яна нямала пра першую краіну сацыялізму, а ўсё ж страшнавата было ляцець у другое паўшар'е.

Масква сустрэла яе шаляснем жоўтага лісця пад нагамі. Сапраўдную восень яна бачыла ўпершыню. Аднак яшчэ больш здзівіла руская зіма. На Кубе тэмпература ніжэй +15°C не апускаецца. Але адчувала сябе Беатрыс тут, у «далёкім» Савецкім Саюзе, як дома. Яе спачатку здзіўляла, што людзі, даведаўшыся, адкуль яна прыехала, радасна ўсклікалі: «Віва Куба! Віва Фідэль!» А некаторыя нават спрабавалі спяваць кубінскія песні. Аказалася, пра яе радзіму тут знаюць усе, яе народ любяць і паважаюць. І рускае радушша, пра якое яна чытала, таксама аказалася не пустым гукам. Яе запрашалі ў госці нават незнаёмыя людзі, распытвалі пра Кубу, прапаноўвалі дапамогу. І ўжо каторы раз адчувала Беатрыс, што няма на свеце нічога больш каштоўнага, чым сапраўдная дружба. Яна разумела, што калі б не правераная часам дружба, якая звязала савецкі і кубінскі народы, не вучылася б кубінская дзяўчына на філасофскім аддзяленні гістарычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна.

...А ўрок удаўся на славу. Рабяты слухалі з захапленнем, задавалі пытанні. Кіраўнік практыкі ацаніў яго на «выдатна». Так што малады сацыёлаг Беатрыс Навара Фернандэс можа выкладаць і рускую мову, якую яна палюбіла за гады вучобы ў Савецкім Саюзе.

**А. ЛЫСЦОЎ,**
выкладчык.


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

Зак. 2238. АТ 13109.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ